



*З кожным часам, з кожнай хвілінай набліжаецца той дзень, калі нашым выпускнікам прыдзецца трымаць апошні экзамен ва універсітэце.*

*Гэты экзамен, які называюць абаронай дыпломнай працы, павінен абагуліць усе тыя веды, што набыў студэнт за час навучання ў ВНУ.*

*Шмат клопатаў і ў студэнта-дыпломніка хімфака Генадзя Касушкова. Перш чым прыступіць да напісання дыпломнай работы, яму прыходзіцца многа часу і энергіі аддаваць працы ў лабараторыі.*

*НА ЗДЫМКАХ: дыпломнік Генадзь Кажушкоў у хімічнай лабараторыі займаецца доследамі, вынікі якіх увойдуць у яго дыпломную працу; злева — выдатніца вучобы студэнтка III курса гістфака Оля Лапцева.*

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 13 (704) ● Пятніца 5 красавіка 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI

## СУСТРЭЧЫ КАЛЕГ

**Ва ўсіх кутках нашай рэспублікі працуе многа выпускнікоў універсітэта. Сярод іх нямала тых, хто можа сказаць аб сабе: «Я закончыў фізфак». А старэйшыя скажуць: «фізмат».**

**30 сакавіка яны сабраліся ў оперным тэатры на традыцыйны вечар сустрэчы. Адкрыў яго сакратар партбюро фізфака П. Л. Салаў.**

**Дэкан факультэта І. П. Зяцькоў расказаў прысутным аб тым, што ўяўляе сабой фізфак у цяперашні час, якія перспектывы яго жыцця.**

**Былы выпускнік факультэта, а цяпер намеснік дырэктара Інстытута фізікі, член карэспандэнт АН БССР, доктар фізіка-матэматычных навук тав. Барысевіч напомніў прысутным аб шляху, пройдзеным фізфакам. Звяртаючыся да студэнтаў, ён заклікаў яшчэ больш актыўна ўключыцца ў навукова-даследчую работу.**

**У заключэнне вечара гаспадары і госці прагледзелі балет «Жызель».**

**Ю. КАРОЛЬ.**

**У гэты ж дзень у галоўным корпусе універсітэта святкавалі сустрэчу гісторыкі. Цёпла вітала прысутных дацэнт кафедры гісторыі СССР М. П. Баранава. Выпускніца 1944 года намеснік рэдактара часопіса «Народная асвета» В. П. Маскаленка расказала аб сваіх равесніках, людзях «шчаслівага і трагічнага пакалення», якія былі сведкамі першых поспехаў сацыялістычнай Радзімы і адстойвалі іх у баях з фашызмам.**

**Выпускнік - выдатнік М. Храбры з вялікай удзячнасцю ўспамінаў выкладчыкаў факультэта і таварышаў аднакурснікаў, якія дапамаглі яму, страціўшаму зрок, атрымаць вышэйшую адукацыю і заняць дастойнае месца ў грамадстве.**

**Дацэнт В. С. Мілавакаў, выпускнік 1949 года, адзначыўшы каштоўнасць добрай традыцыі, прапанаваў сустракацца па секцыях і абменьвацца думкамі, вопытам.**

**Ад імя цяперашняга пакалення студэнтаў гістфака гасцей сардэчна вітала сакратар камітэта камсамола Т. Глушакова.**

**А. КІЕНЯ.**

## БОЛЬШ ЛЕКЦЫЙ ДОБРЫХ І РОЗНЫХ

Універсітэцкая арганізацыя «Веды» аб'ядноўвае 435 навуковых супрацоўнікаў, выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў-старшакурснікаў. Паўсядзённа накіроўвае дзейнасць нашай арганізацыі і аказвае ёй вялікую практычную дапамогу партыйны камітэт БДУ. Пастановы парткома дапамаглі членам таварыства дакладней убачыць свае задачы, знайсці лепшыя формы арганізацыі прапагандысцкай работы. Узрасла актыўнасць членаў таварыства «Веды». Так, з лютага 1966 па сакавік 1968 года членамі нашай арганізацыі прачытана каля пяці тысяч лекцый. Каля 60 працэнтаў з іх—лекцыі на грамадска-палітычныя тэмы.

Як жа таварыства «Веды» будавала сваю працу? Мы зыходзілі з таго, што аснова ў працы — факультэт, кафедра. Кожная з пярвічных арганізацый таварыства «Веды» пры факультэтах мае нешта сваё характэрнае і адпаведнае той навуцы, якая вызначае факультэт. Цікавы вопыт па тэматыцы і методыцы лекцыйнай работы накапіла кафедра навуковага камунізма. Калектыў тут невялікі—11 чалавек. Але гэта высокакваліфікаваныя прапагандысты і лектары. Члены таварыства гэтай кафедры рэгулярна праводзяць у інтэрнатах гутаркі за круглым сталом, вечары пытанняў і адказаў, арганізоўваюць калектыўныя выезды на прадпрыемствы Мінска. За апошні год адбылося 5 такіх выступленняў. Для работы гэтай групы прапагандыстаў характэрны калектывізм — кожнае мерапрыемства рыхтуецца ўсёй кафедрай і атрымлівае тут калектыўную адзнаку.

У апошні час у сувязі з юбілеем Вялікага Кастрычніка работа членаў таварыства на кафедры гісторыі КПСС, палітэканоміі, філасофіі значна актывізавалася. Павялічылася удзельная вага лекцый па гісторыі КПСС (больш 100 у 1967 годзе супраць 60 у 1966 годзе; 182 лекцыі па філасофіі і логіцы у 1967 годзе супраць 50 у 1966 годзе і г. д.). У цяперашні час на грамадскіх кафедрах БДУ (іх 6) членаў таварыства «Веды» — 127 чалавек, а разам з кафедрай педагогікі і псіхалогіі — каля 150 членаў.

Ідэйны і навуковы узровень лекцый па грамадскіх навуках дастаткова высокі, беручы пад увагу водгукі арганізатараў лекцый. Тэматыка гэтых лекцый узнаўлялася, пераглядалася ў мінулым годзе ў святле Пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму развіццю грамадскіх навук і павышэнню іх ролі ў камуністычным будаўніцтве». У сувязі з гэтым былі арганізаваны цыклы лекцый «Кастрычніцкія чытанні» на Мінскім аўтазаводзе, заводзе імя Кірава, у воінскіх часцях Беларускай ваеннай акругі, ва універсітэтах культуры, у народным універсітэце і ў БДУ.

Неабходна адзначыць кафедру педагогікі і псіхалогіі, усе члены якой і асабліва загадчык Сцяпан Андрэевіч Умрэйка многа год праводзяць вялікую лекцыйную работу ва універсітэце педагагічных ведаў, у школах, на прадпрыемствах. Вельмі важна, што сфера дзейнасці гэтай кафедры не абмяжоўваецца Мінскам. За два гады супрацоўнікі кафедры педагогікі прачыталі каля двухсот лекцый.

Адна з лепшых ва універсітэце па колькасці вучоных, па якасці лекцыйнай прапаганды, па выкарыстанню разнастайных форм у рабоце пярвічная арганізацыя філфака (З. С. Мелкіх, Л. І. Фіглоўская, В. А. Захарава, Б. П. Міцкевіч, Н. Н. Рамашка, І. П. Кахно, С. А. Лысенка). Яна шэфствуе над факультэтам «Літаратура і мастацтва» ў Палацы культуры прафсаюзаў. Тут лектары філфака выступаюць у цыклах «Горкаўскія чытанні», «Ленінскія чытанні».

Трэба адзначыць калектыўныя выезды філолагаў. У іх разам з вопытнымі лектарамі ўдзельнічаюць студэнты-старшакурснікі. Гэта своеасаблівая практыка маладых лектараў.

Такія формы характэрны і для дзейнасці арганізацый гістарычнага факультэта. У час зімовых канікул студэнты гісторыкі выступалі 107 разоў, галоўным чынам з тэмай, прысвечанай нашаму універсітэту—яго гісторыі, развіццю, поспехам.

Вельмі добра працуе пярвічная арганізацыя біялагічнага факультэта (старшыня—дацэнт Г. В. Гладкі). Толькі за апошнія два гады сіламі арганізацыі біяфака праведзена 842 лекцыі. На гэтым факультэце рэгулярна чытаюцца лекцыі ў студэнцкіх групах. Добра прайшлі тут «Кастрычніцкія чытанні». Работа лектараў будуецца на аснове экспазіцыйнай тэматыкі і заалагічнага музея.

Вучоныя геолага-геаграфічнага факультэта імкнуцца шырока папулярызаваць у масах дасягненні айчыннай геаграфічнай навукі, звесткі аб краінах свету, па размяшчэнню вытворчых сіл, па эканамічнаму раяніраванню. Вялікую і цікавую работу факультэцкая арганізацыя вядзе па тэме «Карта свету» («Краіны свету»). Такі цыкл арганізаваны ў Палацы культуры трактарнага завода, аналагічны цыкл («Пад небам розных шырот») — у інтэрнатах аўтазавода.

У рабочых клубах атрымліваюць распаўсюджанне «Нядзельныя чытанні». У Палацы культуры трактарнага завода, напрыклад, па праграме «Чытанняў» прайшлі лекцыі прафесара В. Р. Заўрыева «Па дарогах В'етнама», дацэнта О. Ф. Якушка — «Польша». Вялікай папулярнасцю як цікавы лектар карыстаецца дацэнт В. А. Навіцкі.

*(Працяг на 2-й стар.).*

## ПЕРШАПРАХОДЗЕЦ

Цяжка паверыць, што няма больш у жывых Юрыя Аляксеевіча Гагарына. Яшчэ свежыя ўражанні тых незабыўных дзён, калі ўсе людзі планеты з затоеным дыханнем упершыню сачылі за небывалай падзеяй— касмічным палётам чалавека. Тады сэрцы савецкіх людзей поўніліся асаблівым гонарам за сваю Радзіму, грамадзянін якой стаў першым касманаўтам, прадэманстраваўшы ўсяму свету перамогу навукі і тэхнікі краіны сацыялізма. Гэты чалавек увасобіў у сабе лепшыя рысы нашага народа.

Яны загінулі на баявым пасту — два сапраўдныя савецкія чалавекі, два героі, якія да канца выканалі свой доўг перад Айчынай. Яны загінулі, пакінуўшы нам у спадчыну сваю славу, свае непаўторныя прыклады мужнасці, адвагі, бескарыснага служэння Радзіме.

Пройдуць дзесяцігоддзі і вякі. Гісторыя засваення космасу ўзбагаціцца новымі перамогамі і імёнамі, але назаўсёды застануцца неўміручымі подзвіг і імя чалавека, які першы пераадолеў зямное прыцяжэнне, правафлангавага бліскучай плеяды савецкіх касмапраходцаў—Юрыя Аляксеевіча Гагарына.

І. НЕКРАШЭВІЧ,
прафесар, загадчык кафедры радыётэхнікі і фізічнай электронікі.

## ГОРДАСЦЬ І БОЛЬ ЗЯМЛІ

**Глыбокім смуткам адклікнулася ў сэрцах людзей вестка аб гібелі першага касманаўта Юрыя Аляксеевіча Гагарына. Сем год назад свет упершыню пазнаў імя гордага Сокала, які падняўся ў прасторы сусвету. Тады мы былі бязмежна шчаслівымі ад таго, што наш суайчыннік, адзін са шматмільённай сям'і, праклаў першую касмічную трасу. Сем год назад яму апладыравала планета. Героя асыпалі кветкамі. Цяпер смуткуе Зямля, яна аплаквае свайго сына.**

**Цяжка прымірыцца з рэальнасцю гэтай утраты. Для нас Юрый Аляксеевіч быў самым блізкім, добра знаёмым героем, бязмежна смелым, прывабным чалавекам.**

**Смерць герояў заўсёды рамантычна, нават таму, што яна незвычайная. Адна мая аднакурсніца добра сказала, што смерць Юрыя Аляксеевіча была іменна гагарынскай, а не ад якога-небудзь віруса ці хваробы. Але ад гэтага горыч утраты не змяншаецца.**

**Развітваючыся з Гагарыным у дні горкаўскага юбілею, мы адчувалі, што развітваемся з Сокалам, які застанецца ў памяці пакаленняў яскравым прыкладам служэння Айчыне.**

**А. АПЕЛЬ,**
**студэнтка.**

# ТВАЕ ВЫКЛАДЧЫКІ, СТУДЭНТ

## НА ПЯРЭДНІМ КРАІ НАВУКІ

**За актыўную навукова-педагагічную дзейнасць акадэмік Ц. М. Годнеў узнагароджан Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Нядаўна яму споўнілася семдзесят пяць год. Нават па шкале каўказскіх доўгажыхароў гэта ўжо сярэдні ўзрост, але энергіі Ціхана Мікалаевіча могуць пазайздросціць многія маладыя. Вось адзін з самых свежых фактаў яго навуковай біяграфіі. Некалькі месяцаў назад у Акадэміі навук СССР разглядалася пытанне, каму з біёлагаў краіны прысудзіць за вынікі працы ў юбілейным 1967 годзе Ціміразеўскую прэмію. Аднадушна было вырашана адзначыць ёю старэйшага вучонага Беларусі Ціхана Мікалаевіча Годнева за манаграфію «Хларафіл, яго будова і ўтварэнне ў расліне». Выступаючы пры ўручэнні прэміі, Вучоны сакратар Прэзідыума Акадэміі навук СССР акадэмік Я. В. Пейве падкрэсліў, што кніга Ц. М. Годнева падводзіць вынікі даследаванняў айчынных і замежных вучоных, а таксама плённай шматгадовай працы самога аўтара і яго калег. У манаграфіі падрабязна разглядаецца сучасны стан вучэння аб хларафіле і яго ўдзел у будове арганічнага рэчыва, падрабязна таксама асвятляецца будова малекул хларафіла і яго хімічны сінтэз.**

**У 1922 годзе ў «Астраханскім медыцынскім часопісе» Ціхан Мікалаевіч надрукаваў сваю першую навуковую працу — «Аб структурнай формуле хларафіла і геціна». Цяпер у яго звыш 150 прац, пяць з якіх пераведзена на еўрапейскія мовы. Кавалер двух ардэноў Леніна, ордэна «Знак Пашаны», ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга, заслужаны дзеяч навукі БССР Ц. М. Годнеў падрыхтаваў дзесяткі вучняў, якія працуюць у многіх раёнах рэспублікі і ўсёй краіны. Звыш сарака год яго плённая педагагічная і навуковая дзейнасць звязана з нашым універсітэтам.**

**А. КАЛЕЧЫЦ.**

## ПЛАТОНАЎСКІ ПОЧЫРК

Нядаўна самы малады доктар навук Беларусі прафесар нашага універсітэта У. П. Платонаў па запрашэнню сваіх балгарскіх калег выязджаў у Сафію, дзе на працягу двух тыдняў чытаў лекцыі па вышэйшай матэматыцы. І там, як гэта было не раз з Уладзімірам Пятровічам, у яго спыталі, чым ён захапляецца, акрамя матэматыкі.

— Люблю музыку, паэзію, — такі быў адказ. Уладзімір Пятровіч мог і далей пералічваць свае хобі, але сярод усіх музыка і паэзія — галоўныя. І гэта не выпадкова. Маючы на ўвазе матэматыку, Соф'я Кавалеўская пісала: «Па сутнасці, гэта навука, якая патрабуе найбольш фантазіі, і адзін з першых матэматыкаў нашага стагоддзя гаворыць сапраўды правільна, што нельга быць матэматыкам, не будучы ў той жа час і паэтам у душы. Толькі, разумеецца, каб усвядоміць вернасць гэтага вываду, трэба адмовіцца ад строгіх забабонаў, што паэт павінен штосьці ствараць неіснуючае, што фантазія і выдумка—гэта адно і тое ж. Мне здаецца, што паэт павінен бачыць тое, чаго не бачаць іншыя, бачыць глыбей за іх. І гэта ж павінен і матэматык».

Для камсамольца Платонава свет лічбаў, алгебраічных сімвалаў, абстракцый — своеасаблівы свет музыкі і паэзіі, у якім нараджаюцца свае сімфоніі, вершы, паэмы. Нягледзячы на даволі такі не прафесіянальны ўзрост—яму дваццаць сем год — Уладзімір Пятровіч кіруе кафедрай алгебры і тапалогіі нашага універсітэта, а яго навуковыя даследаванні вядомы далёка за межамі рэспублікі, краіны. З ім вядзе перапіску буйнейшы матэматык Францыі Арман Барэль, з ім кансультуецца прафесар універсітэта штата Арэгон у ЗША Кеннет Росс. Лаўрэат Ленінскай прэміі акадэмік А. І. Мальцаў так характарызуе беларускага вучонага: «Цяпер не выклікае сумнення той факт, што У. П. Платонаў, нягледзячы на маладосць, з'яўляецца галоўным аўтарытэтам у нашай краіне ў двух сучасных галінах матэматыкі — тэорыі алгебраічных лінейных груп і тэорыі тапалагічных груп».

Некалькі год назад, пасля абароны Уладзімірам Пятровічам кандыдацкай дысертацыі, я спытаў у яго, чаму ён выбраў матэматычны факультэт, мо гэтаму дапамагла школа? Адказ здзівіў мяне.

Аказалася, што ў школе ні аднаму прадмету ён не аддаваў перавагі. Юнак аднолькава ўважліва слухаў матэматыка і гісторыка, літаратара і хіміка, географа і фізіка, таму што кожны адкрываў перад ім штосьці новае, невядомае, захапляючае. Але лепш спачатку.

У Багушэўскую сярэднюю школу, што на Віцебшчыне, Валодзю прывялі, калі яму было толькі шэсць гадоў. Безумоўна, у дырэктара ўзнікла пытанне: «Чаму так рана?» Потым высветлілася, што хлопчык свабодна чытае, а ў ліках не блытаецца да тысячы і больш. Так у першым класе з'явіўся белагаловы хлапчук.

— Зусім дзіця, — дзівіліся настаўнікі, — яму яшчэ ў цацкі гуляць...

А гэтае дзіця на выдатна скончыла першы клас, затым другі, потым у школе стала звычайным, што заўсёды пры падвядзенні вынікаў вучобы першым называлася імя Платонава.

Шаснаццаць год. Валодзя атрымлівае атэстат сталасці і залатую медаль.

Цяпер у дарогу. Куды? Юнак даўно вырашыў паступіць ва універсітэт. На матэматычным факультэце здольнага студэнта прыкмецілі акадэмік Д. Супруненка, дацэнт А. Радаў, іншыя выкладчыкі. Платонаву пачалі даваць больш складаныя заданні. Ён паспяхова спраўляўся, яго навуковыя працы не раз адзначаліся на аглядах студэнцкіх даследаванняў. і хутка матэматыкі Беларусі усур'ёз сталі гаварыць аб платонаўскім почырку. Сапраўды, ён выдзяляўся строгасцю, асаблівай выразнасцю, быў характэрным.

У 1961 годзе, калі Уладзіміру Платонаву стукнула дваццаць адзін, ён скончыў універсітэт і быў астаўлены ў аспірантуры. Праз два гады ён абараніў кандыдацкую дысертацыю, а яшчэ праз два прадставіў доктарскую — «Тапалагічныя і алгебраічныя групы». Трэба сказаць, што тады ў гэтай галіне навукі, якую можна назваць матэматычнай сястрой эйнштэйнаўскай тэорыі адноснасці, працавалі нямногія. Уладзімір Пятровіч быў не толькі адным з піянераў новых галін матэматыкі, але стаў галоўным іх аўтарытэтам. Да такога вываду прыйшлі і акадэмік А. І. Мальцаў і другія апаненты — член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР Каргаполаў і прафесар В. Чарын, якія выступілі ў Інстытуце матэматыкі Сібірскага філіяла АН СССР па дысертацыі Платонава пры яе абароне.

Са студзеня 1968 года Уладзімір Пятровіч — прафесар. Яго лекцыі, семінары ва універсітэце выклікаюць вялікую цікавасць у студэнтаў не толькі тым, што малады прафесар глыбока ведае свой прадмет, даступна выкладае самы складаны матэрыял. Ён часцей за ўсё разам са слухачамі шукае адказы на пытанні, узбуджае творчую думку, накіроўвае моладзь на вырашэнне праблем, якімі яшчэ ніхто не займаўся. У гэтым таксама вырашаецца «платонаўскі» почырк.

Уладзімір Пятровіч ужо зрабіў нямалы ўклад у развіццё айчыннай навукі. Але, знаёмячыся з яго дзейнасцю, пераконваешся, што вучоны запоўніў толькі першыя свае старонкі вялікай кнігі, імя якой сучасная навука.

**М. РЭГІСТАНАЎ.**

## ТВОРЧЫ НЕПАКОЙ



У жыцці кожнага сустракаецца такі чалавек, які пакідае глыбокае ўражанне аб сабе на доўгія гады. Для мяне такім чалавекам стала Анна Мартынаўна Базыленка — цудоўны педагог, вядомы вучоны, цікавы і прывабны чалавек. Учора ёй споўнілася 60 год.

Анна Мартынаўна нарадзілася на Аршаншчыне ў сям'і селяніна-бедняка, і, напэўна, жыццё яе было б нічуць не лепшым, чым жыццё яе бацькі і маці, каб не Кастрычніцкая рэвалюцыя, якая адкрыла перад усім беларускім народам новыя шляхі ў жыццё.

Ужо ў 1921 годзе яна праводзіць актыўную культурна-асветніцкую работу на вёсцы, выконвае шматлікія камсамольскія і партыйныя даручэнні.

Шлях у навуку Анны Мартынаўны пачаўся з 1924 года: яна паступае ў Віцебскі педтэхнікум. А пасля—БДУ, літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне. Скончыла універсітэт у 1930 годзе. Доўгі час выкладае ў педтэхнікумах Слуцка і Мінска. З 1944 года А. М. Базыленка працуе на кафедры рускай мовы нашага універсітэта. У дваццатыя гады А. М. Базыленка, з'яўляючыся членам літаратурнай арганізацыі «Маладняк», часта выступала ў друку з апавяданнямі і аповесцямі. Яе творы прыхільна сустракаліся чытачом. Аб таленце пісьменніцы станоўча адклікаліся літаратурныя крытыкі Беларусі.

Любоў да мастацкага слова прывяла Анну Мартынаўну да навукова-даследчай работы. З пад пяра вучонага выйшлі такія каштоўныя даследаванні, як «Мова ранняй творчасці Я. Коласа», «Вобразы і кампазіцыя паэмы Я. Коласа «Адплата», «Да пытання аб фразеалагічных адзінках беларускай мовы», «Пабочныя канструкцыі ў беларускай мове» і іншыя. Яе артыкулы па актуальных праблемах часта можна прачытаць у літаратурных часопісах, газетах.

Шчаслівы лёс у Анны Мартынаўны—педагога. Слухаць яе лекцыі — сапраўдная радасць, таму што яны чытаюцца выдатным знаўцам сваёй справы, натхнёным вучоным. Студэнты, якія слухаюць дацэнта А. М. Базыленка, атрымліваюць запал вялікай любві да філалогіі, да роднага краю. Свой вопыт даследчыка, свае вялікія веды Анна Мартынаўна перадае студэнтам як кіраўнік гуртка па вывучэнню мастацкай літаратуры. Студэнты любяць Анну Мартынаўну за яе няўрымслівасць, творчае гарэнне, за яе вялікае, прыгожае сэрца.

У гэтыя дні Анна Мартынаўна атрымала шмат віншавальных тэлеграм і пісем ад сваіх вучняў, якія працуюць у розных кутках Беларусі і за яе межамі. Хочацца далучыцца і свае сардэчныя пажаданні даўгалецця, новых творчых поспехаў.

**А. ЛЯПІЧ,**
**рэдактар выдавецтва БДУ.**

## НАШ СТАРЭЙШЫ СЯБАР

*Першае верасня, 1967 год. Усе шчаслівыкі-першакурснікі юрыдычнага факультэта хвалююцца. Ды чаму б і не: наперадзе сустрэча з выкладчыкамі вышэйшай навучальнай установы. І, вядома, хацелася б хоць што-небудзь ведаць аб кожным з іх. Адным з першых выкладчыкаў, з кім нам давялося пазнаёміцца, была Валянціна Васільеўна Сарокіна. Курс сустрэў яе крыху насцярожана, але з зацікаўленасцю. Аднак па меры таго, як мы больш пазнавалі гэтага чалавека, знікала і адчужэнне. Строгая, але разам з тым уважлівая і чулая, яна заваявала нашы сімпатыі.*

*Валянціна Васільеўна прайшла суровую школу выпрабаванняў. Вучоба ў педвучылішчы, праца ў Казахстане, дзе яе застала вайна, фронт, пасля вайны — партыйная работа. Цяпер — дацэнт універсітэта. Цікава праходзяць яе лекцыі па гісторыі дзяржавы і права СССР.*

*З хваляваннем чакалі мы сваю першую сесію, якая скажа, быць табе сапраўдным студэнтам ці не. Напярэдадні экзамена сабраліся на кансультацыю па гісторыі дзяржавы і права СССР. Многа было незразумелага, але Валянціна Васільеўна дапамагла разабрацца.*

*Свае веды В. В. Сарокіна перадае студэнтам не толькі на лекцыях, яна кіруе навуковым студэнцкім гуртком, вядзе вялікую грамадскую работу, некалькі гадоў запар выбіраецца членам партыйнага бюро факультэта, нясе іншыя грамадскія абавязкі.*

*Валянціна Васільеўна часта гутарыць са студэнтамі, унікае ў іх жыццё і гэтым авалодвае студэнцкімі сэрцамі.*

*Студэнты першага курса юрфака.*

## БОЛЬШ ЛЕКЦЫЙ ДОБРЫХ І РОЗНЫХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

**На фізічным факультэце члены таварыства вядуць школу юных фізікаў, удзельнічаюць у правядзенні алімпіяд (прафесары Левашоў, Вафіядзі, дацэнт Камароў і інш.).**

**Своеасаблівыя формы работы адрозніваюць арганізацыі матэматычнага, хімічнага, юрыдычнага факультэтаў.**

**Актыўна праявіла сябе універсітэцкая секцыя гераіка-патрыятычнага выхавання, якая аб'ядноўвае 25 чалавек (старшыня секцыі І. Ф. Мікрукоў). Гэта секцыя за год арганізавала больш 200 выступленняў, прысвечаных юбілейным датам Савецкіх Узброеных Сіл, героям Вялікай Айчыннай вайны, традыцыям Савецкай Арміі.**

**Члены універсітэцкай арганізацыі удзяляюць вялікую увагу і друкаванай прапагандзе: апублікаваны каля 30 брашур і матэрыялаў у дапамогу лектарам, распрацавана 15 тэм, якія увайшлі ў зборнік «Гутаркі аб прыродзе і грамадстве». Вялікая колькасць супрацоўнікаў БДУ актыўна ўдзельнічае ў рабоце навукова-метадычных саветаў і секцый.**

**У цяперашні час арганізацыі таварыства «Веды» шырэй практыкуюць распаўсюджванне навуковых ведаў у пэўнай сістэме, арганізуючы цыклы лекцый «Актуальныя праблемы навукі», «Па краінах свету», «Ленінскія чытанні», «Гутаркі за круглым сталом», «50 год БССР і КПБ», «Наш Буравеснік» («Горкаўскія чытанні»). Такія цыклы ўжо праводзяцца на Мінскім аўтазаводзе, у Палацы культуры трактарнага завода, у ГПТУ-77, у оперным тэатры, у Палацы культуры прафсаюзаў і ў лекторыях універсітэта.**

**Аднак неабходна адзначыць недастатковую, галоўным чынам арганізацыйна-метадычную работу на юрыдычным, фізічным, матэматычным і хімічным факультэтах. На юрыдычным, напрыклад, бюро пярвічнай арганізацыі (тт. Віхараў, Нікіцін), не займалася арганізацыяй і ўлікам лекцыйнай прапаганды, не праяўляла ніякай ініцыятывы ў арганізацыі цікавых лекцый на факультэце і ў інтэрнаце.**

**Найбольш вузкім месцам у нашай лекцыйнай дзейнасці з'яўляецца падрыхтоўка лектарскіх кадраў. На працягу некалькіх год мы не можам арганізаваць як патрэбна школу маладога лектара. У гэтым вінаваты і камітэт камсамола, і факультэт грамадскіх прафесій, якім даручана займацца гэтай школай.**

**Варта сур'ёзна задумацца над тым, каб лектарскае майстэрства, уменне валодаць словам прывівалася студэнтам з першых жа дзён іх прабывання ў аўдыторыях універсітэта. Развіццё у студэнтаў здольнасці папулярызацыі атрыманых спецыяльных ведаў павінна стаць неад'емнай часткай вучэбна-выхаваўчага працэсу.**

**Значным недахопам у нашай рабоце з'яўляецца і тое, што добрая чвэрць членаў арганізацыі «Веды» або зусім не выступае, або вельмі рэдка выступае перад народам з папулярнымі лекцыямі, ці гутаркамі. Нарэшце, мы не заўсёды строга улічваем запатрабаванні і зацікаўленасць слухачоў, неабходнасць дыферэнцыраванага падыходу да аўдыторыі. Відавочна, метадычныя указанні лектарам павінны абапірацца на вынікі глыбокіх сацыялагічных даследаванняў.**

**У многім перашкаджае поспеху лекцыйнай работы адсутнасць каардынацыі працы паміж грамадскімі арганізацыямі факультэтаў, кафедр і таварыства «Веды».**

**Асноўным звяном, ад якога у значнай меры залежыць размах, якасць і дзейснасць прапаганды, з'яўляюцца факультэцкія арганізацыі таварыства. Кожная пярвічная арганізацыя павінна стаць баявым жыццядзейсным прапагандысцкім калектывам, актыўным памочнікам партыйных арганізацый у камуністычным выхаванні моладзі і працоўных.**

**У гэтыя дні мы павінны мабілізаваць нашы лектарскія кадры для дастойнай сустрэчы юбілею рэспублікі і стагоддзя з дня нараджэння У. І. Леніна.**

**М. РЭЗНІКАЎ,**
**старшыня раённага аддзялення таварыства «Веды».**

## ДА АГЛЯДУ СТУДЭНЦКАГА НАСЦЕННАГА ДРУКУ

# Vita

БГУ
БИОЛОГ

Гэтая старонка поўнасцю складзена з матэрыялаў насценнай газеты біяфака. Яе баявітасць, прынцыповасць, выдатнае і своеасаблівае мастацкае афармленне заўсёды вабяць да сябе не толькі студэнтаў біяфака.

«Жыццё» — так сведчыць назва газеты, якой хутка споўніцца 20 гадоў. Гэта назва невыпадковая. Газета яскрава адлюстроўвае жыццё ўсяго факультэта.



*Для студэнтак другога курса біяфака Тамары Саргавец і Люды Смірновай заняткі па біяхіміі раслін заўжды цікавы.*

# ПАТРАБУЕЦЦА НАСТАЎНІК...

Цяжкія дзверы адчыняюцца і зачыняюцца, упускаючы студэнтаў, а выпускаючы новаспечаных педагогаў, аспірантаў і шчаслівычыкаў са «свабоднымі дыпломамі». Слёзы і ўсмешкі, усхваля[illegible]ныя твары і гарачыя вс[illegible] страх і хваляванне і...[illegible]ават гумар — усё побач. Ідзе размеркаванне. Гэта ўсё па гэты бок дзвярэй, а па той...

Спакойная камісія, якой даўно ўжо ўсё зразумела, і прадстаўнікі розных прадпрыемстваў і ўстаноў, якія прыйшлі для таго, каб «адваяваць» сабе спецыялістаў.

Прайшлі аспіранты, сямейныя, цяпер чарга тых, хто прэтэндуе на свабодны дыплом. Іх дастаткова. Пасля чацвёртага чалавека начальнік аддзела кадраў у роспачы ўздыхае: «Раздзенеце вы дзяржаву, дзяўчаты! Вучы-вучы вас, а вы раз-два—замуж павыходзіце і давай вам свабоднае працоўнае ўладкаванне. А ў нас спецыялістаў не хапае». Але што зробіш — даводзіцца даваць.

Задаволіць усе густы проста немагчыма. Аднаму хочацца рухаць навуку, другому куды папала, абы толькі не ў вёску, трэці разнервавана стукае дзвярыма за прапанову быць настаўнікам у Мінску. Ну, а пра школу недзе ў раёне не можа быць і гутаркі.

Чаму ж не хочуць быць студэнты педагогамі? Мабыць, тут вінавата іх цвёрдая ўпэўненасць у тым, што яны нарадзіліся для навуковай дзейнасці, а можа... яны разумеюць, што не могуць быць педагогамі, што мала ў іх для гэтага педагагічных ведаў, вельмі мала вопыту.

А практыка? Наконт гэтага адна студэнтка сказала: «Хіба ж гэта практыка! Гэта гульня ў школу, як гулялі некалі ў дзяцінстве. Таму яна дае вельмі мала».

Ідзе размеркаванне. Падводзяцца вынікі вучобы і працы кожнага.

**О. ГАЛАМАКА,**
студэнтка трэцяга курса.

## *У ХАЛАДЫ, ХАЛАДЫ*

*Вось і закончылася наша II зімовая экспедыцыя па плану Міжнароднай Біялагічнай Праграмы. Цяпер ёсць пра што ўспомніць, ёсць над чым падумаць. Ці было нам лёгка, ці цяжка ў гэтай паўтарамесячнай адсутнасці — мы былі рады ўсяму. І чым цяжэй даводзілася, тым ахвотней усе браліся за працу. Дзесяткі кіламетраў працягнулі мы нашы сані з каштоўным навуковым грузам. Штодзённа прыходзілася выдоўбліваць у таўшчыні лёду дзесяткі лунак, каб дастаць некалькі літраў азёрнай вады, некалькі міліграмаў планктона. Кожнае возера мае свае адметныя асаблівасці. І калі на Нарачы з сярэдзіны возера цяжка ўбачыць берагі, то на Галубіным — яны побач.*

*Працавалася нам заўсёды лёгка. Ды ці можна скардзіцца на лёс, калі кожны член экспедыцыі — непаўторны чалавек. Гэта і наша «мама» Паліна Самойлаўна і нашы мілыя дзяўчаты — Лена, Лора, Люда, і вечна занятая Раіса Зенонаўна.*

*Ю. ГІГІНЯК,*
*студэнт чацвёртага курса.*

# ПРЫНЦЫПОВАЯ РАЗМОВА

27 сакавіка адбыўся адкрыты партыйны сход, прысвечаны рабоце камсамольскай арганізацыі біяфака.

Сход быў бурны і ажыўлены, таму што быў добра падрыхтаваны. Вычарпальны аналіз работы камсамольскай арганізацыі быў дадзены ў дакладзе сакратара камітэта камсамола П. Кахнюка. Гэта была своечасовая сур'ёзная размова аб камсамольскай рабоце на факультэце ў цэлым і ў некаторых групах.

У апошні час адбылося многа падзей, хоць і дробных, але якія паказваюць, што з думкай камітэта камсамола не лічацца. Да гэтых фактаў адносяцца такія падзеі, як размеркаванне стыпендый, калі камсоргі курсаў былі адхілены ад размеркавання.

У некаторых выпадках дэканат крочыць не ў нагу з камітэтам камсамола. Так, у прыватнасці, камітэт камсамола аб'явіў вымову за пастаянныя пропускі заняткаў некаторым студэнтам, а дэканат, у той жа час назначае ім заахвочвальныя стыпендыі. Так атрымалася са студэнтамі Арловым, Ларыёнавым, Папеняй і іншымі.

На сходзе ўдзялялася ўвага пытанню аб тым, што прадстаўнікі камітэта камсамола па сутнасці з'яўляюцца бяспраўнымі пры дзяржаўным размеркаванні. Іх думкі ніхто не пытае і ніхто не слухае. Гэта ў корані няправільна. Каму ж, як не камітэту камсамола, ведаць якога месца варты пры размеркаванні той ці іншы камсамолец. У многіх выступленнях падкрэслівалася, што арганізацыйная работа на біяфаку стаіць на незвычайна нізкім узроўні. Вынікам гэтага з'яўляюцца спартыўныя «дасягненні» біяфака і асабліва правал мастацкай самадзейнасці на апошнім аглядзе.

Асноўная віна за правал ляжыць на камітэце камсамола. Але, нягледзячы на гэта, на камітэце не абмяркоўваліся яго прычыны. «Пасля сваркі — кулакамі не размахваюць», — гаворыць сакратар камітэта камсамола. Так, калі гэта сварка. Але калі гэта падрыхтаваны матч, то пры любым выніку ён павінен абмяркоўвацца і разбірацца пад кіраўніцтвам трэнера.

Нясуць адказнасць за правал мастацкай самадзейнасці і дэканат, і партбюро факультэта.

Нашай мастацкай самадзейнасці патрэбен кіраўнік; сродкаў у дэканата няма. Але калі камітэт камсамола прапанаваў кампрамconfigurationснае рашэнне — перавесці студэнта вячэрняга аддзялення Окуня на стацыянар з тым, каб яму зручней было займацца аркестрам — дэканат прыйшлося запэўніваць два гады. Натуральна, рашэнне прыйшло вельмі позна.

Увогуле, дэканат вельмі раўнадушна адносіцца да мастацкай самадзейнасці. Яскравым прыкладам гэтага з'яўляецца адмена вечара, падрыхтаванага да 5 снежня студэнтамі біяфака і радыётэхнічнага інстытута. У выніку ў студэнтаў знікае ўсякая зацікаўленасць да мастацкай самадзейнасці. Сапраўды, каму патрэбна самадзейнасць для самадзейнасці. Нясе адказнасць за правал і партбюро, у прыватнасці, адказная за самадзейнасць В. М. Ткач.

На сходзе абмяркоўваліся пытанні і работы «Камсамольскага пражэктара».

На сходзе адзначалася таксама, што, нягледзячы на некаторыя недахопы, работа камітэта камсамола стала больш каардынаванай. Значнай заслугай яго была падрыхтоўка да святкавання 50-годдзя Савецкай улады. Матэрыялы сходу будуць шырока абмяркоўвацца на курсах і ў групах факультэта.

**Т. ЧУРСІНА,**
**студэнтка трэцяга курса.**

# НА ШЛЯХУ ПОШУКУ

Асноўным напрамкам навукова-даследчых прац па кафедры заалогіі беспазваночных з'яўляецца гідрабіялагічны. У апошняе дзесяцігоддзе па меры павышэння кваліфікацыі кадраў значнае месца сталі займаць спецыяльныя палявыя і лабараторныя працы па гідрабіялогіі і ў першую чаргу па актуальнай для сучаснай біялогіі праблеме — біялагічнай прадуктыўнасці прэснаводных экасістэм.

Асабліва вялікую ўвагу кафедра ўдзяляе вывучэнню заканамернасцей далейшых этапаў прадукцыйнага працэсу ў вадаёме.

Па матэрыялах гэтых даследаванняў у апошнія гады абаранілі дысертацыі Э. А. Шушкіна, Г. А. Печань, Г. А. Галкоўская, Л. В. Камлюк. На днях адбудзецца абарона яшчэ двух дысертацый па гэтай жа праблеме — А. П. Астапеняй і Н. М. Кручковай.

Даследаванні гэтых пытанняў уваходзяць у кола праблем Міжнароднай Біялагічнай Праграмы, у якой прымае ўдзел і Савецкі Саюз. Канчатковая мэта іх — распрацоўка навуковай асновы ўпраўлення прадукцыйным працэсам для патрэб чалавека як па шляху забеспячэння ўсё ўзрастаючай неабходнасці ў чыстай вадзе, так і па шляху павышэння эфектыўнасці выкарыстання біялагічных рэсурсаў вадаёмаў для спажыўных і тэхнічных патрэб.

Тэарэтычныя асновы вывучэння прадукцыйнага працэсу ў прэсных вадаёмах абагулены ў кнізе «Метады вызначэння прадукцыі вадзяных жывёл», якая толькі што выйшла ў беларускім выдавецтве «Вышэйшая школа». У ёй сабраны і крытычна разгледжаны ўсе вядомыя ў цяперашні час метады вызначэння прадукцыі планктона і бентаса (разліковыя, графічныя, фізіялагічныя, радыяцыйныя) і дадзена колькасная ацэнка ролі прадукцыі відавых папуляцый у экалагічнай сістэме вадаёмаў.

Кніга падрыхтавана калектывам аўтараў і выдадзена пад рэдакцыяй прафесара Г. Г. Вінберга, якому належаць асноўныя ідэі і тэарэтычная аснова метадаў разліку прадукцыі. Вялікі ўдзел у стварэнні гэтай навуковай працы прынялі вучні Г. Г. Вінберга Г. А. Печань, Э. А. Шушкіна, П. Г. Пятровіч, Г. А. Галкоўская, А. П. Астапеня, а таксама вучоныя з іншых устаноў Савецкага Саюза.

Выкладзеныя ў кнізе метады знойдуць шырокае прымяненне пры вывучэнні водных арганізмаў, якое будзе праводзіцца ў большасці краін свету, ва ўсіх біягеаграфічных зонах зямнога шара па Міжнароднай Біялагічнай Праграме. Пры такім размаху работы стандартызацыя методыкі мае асабліва важнае значэнне, таму што дазваляе дасягнуць супастаўленасці атрыманых вынікаў у сусветным маштабе.

У разглядаемай кнізе, акрамя апісання метадаў азначэння прадукцыі водных жывёл, дадзены канкрэтныя прыклады прымянення іх пры даследаванні прадуктыўнасці вадаёмаў Беларусі і іншых раёнаў Савецкага Саюза.

**В. ЛЯХНОВІЧ,**
**дацэнт кафедры заалогіі беспазванковых.**



*Аспірант кафедры біяхіміі і біяфізікі Іван Даўгалевіч ужо цвёрда стаў на навуковую сцяжынку.*

*У гэтым годзе ў час зімовых канікул, калі ў Мінску праходзіла навуковая біяхімічная канферэнцыя, у ліку многіх прадстаўленых работ была і работа Івана Даўгалевіча.*



*Студэнткі чацвёртага курса Лена ШУЛЬГА і Людміла ЗАКІРАВА ў час практычных заняткаў.*

# НА АНГЛІЙСКАЙ МОВЕ

ПЕРАДАВЫ ВОПЫТ

У мінулым навучальным годзе наша кафедра перабудавала выкладанне англійскай мовы на матэматычным факультэце. Раней першы семестр мы прысвячалі паўтарэнню матэрыялу сярэдняй школы. Неабходнасць у гэтым, на жаль, існуе і па сённяшні дзень, бо студэнты прыходзяць ва універсітэт з вельмі слабымі ведамі матэрыялу сярэдняй школы, ды і ўзровень ведаў у групе бывае розны: разам са слабымі студэнтамі трапляюць у групу і тыя, хто добра ведае мову.

Кафедра вырашыла праводзіць паўтарэнне матэрыялу сярэдняй школы адразу ж на тэматычных тэкстах. Тэксты гэтыя простыя па зместу — арыфметыка, алгебра, геаметрыя, трыганаметрыя — усё знаёмае студэнтам з сярэдняй школы. Вывучаючы такія тэксты, студэнты набываюць параўнаўча большы запас матэматычных тэрмінаў, слоў, злучэнняў, акрамя таго, на гэтым матэрыяле лёгка развіваць навыкі гутарковай мовы. Усе студэнты могуць па-англійску складаць, адымаць, памнажаць і дзяліць дробы, рашаць простыя алгебраічныя ўраўненні, даказваць простыя тэарэмы.

У другім семестры мы пераходзім на тэксты ўжо вышэйшай матэматыкі, якія да гэтага часу вывучаны на лекцыях.

Сёння можна падвесці некаторыя вынікі перабудовы. Амаль усе студэнты другога курса параўнаўча лёгка спраўляюцца з перакладам тэкстаў па вышэйшай алгебры, матэматычнаму аналізу і геаметрыі без слоўніка. У канцы года ім даецца кантрольная работа—пераклад тэксту без слоўніка (вядома, падобны на тыя, што выкарыстоўваліся ў семестрах).

Студэнты трэцяга курса чытаюць і перакладаюць матэрыялы на свой выбар. Бывае, што гэта тэкст па цікавячаму іх пытанню або матэрыял для курсавой работы ці даклада ў навуковым гуртку. Але, на жаль, часцей за ўсё гэта выпадковы матэрыял, які студэнт змог знайсці.

На экзамене ў гэтым годзе трэцякурснікі ўпершыню атрымаюць тэксты для перакладу без слоўніка. Хочацца верыць, што яны паспяхова з імі справяцца.

Просьба да выкладчыкаў спецыяльных кафедр — больш рэкамендаваць студэнтам артыкулаў на англійскай мове, тады валоданне ёю стане для ўсіх неабходнасцю.

**Т. КАВАНАВА.**



*Бачыць вока...*

*Фотаэцюд А. БЯРЖЫНСКАГА.*

# У ГОСЦІ ДА СОНЦА

Блакітны аўтобус шпарка імчыць па мокрай шашы. За вокнамі мігцяць, зліваюцца ў жывую стракатную сцяну маладыя бярозы і статныя маўклівыя сосны. Пасажыры аўтобуса — музыканты і салісты эстраднага аркестра БДУ імя У. І. Леніна. Іх багаж — трубы, гітары, саксафоны, трамбон, ударнік і вялізны кантрабас. Але галоўны скарб, які ўзялі з сабою ў дарогу самадзейныя артысты—гэта песні, танцы, пантаміма, добры студэнцкі настрой.

Наогул, дакладней было б назваць гэты аўтобус міжпланетным экспрэсам. «Чаму?» — здзівіцеся вы. Таму што гэта падарожжа не зусім звычайнае: студэнты едуць у госці да сонца. Так-так, я не памыліўся і нават не жартую. Справа ў тым, што эстрадны калектыў запрасілі да сябе ў госці стваральнікі новага электрычнага сонца Беларусі — будаўнікі Лукомльскай ДРЭС.

За вокнамі экспрэса, быццам метэоры, пралятаалі белыя кіламятровыя слупы. Вечарэла. Чырвоны дыск сакавіцкага сонца станавіўся ўсё большым і большым. Вось ён ужо амаль крануўся гарызонту. Здавалася: яшчэ некалькі імкненняў палёту — і да яго можна будзе дакрануцца рукой. Нечакана экіпаж аўтобуса заўважыў, як у промнях сонца вылучыліся велічныя абрысы будоўлі. Мы пад'язджалі да аднаго з самых маладых у нашай рэспубліцы горада энергетыкаў — Новалукомля.

Эстрадны аркестр — самы малады мастацкі калектыў універсітэта. Яму няма яшчэ і двух год, але ўзрост далёка не дзіцячы. Каля шасцідзесяці разоў студэнты выступалі перад гаспадарамі палёў, рабочымі, будаўнікамі, воінамі. Аркестр удзельнічаў у VIII і IX Усесаюзных універсіядах, якія штогод праводзіць Ленінградскі універсітэт, выступіў на свяце студэнцкай песні ў Тарту. І дзе б ні выступалі студэнты, яны заўсёды імкнуцца данесці да слухачоў той ці іншы твор у самым бліскучым выкананні. Не дзіўна, што і гэты канцэрт у Новалукомлі прайшоў паспяхова.

Будаўнікі сардэчна і цёпла прынялі гасцей з Мінска. Канцэрт спадабаўся ім. Доказ гэтаму — шматлікія апладысменты і тое, што большасць нумароў праграмы па іх просьбе выконвалася двойчы. Гледачы вельмі рады былі сустрэцца з Верай Фацеевай, студэнткай гістарычнага факультэта. Вера сама піша вершы і музыку да іх. І цяпер яна выканала адну са сваіх песень, «Для цябе», і песню пратэсту з рэпертуару італьянскага спевака Джані Марандзі—пра хлопца, якога пад акампанемент аўтаматнай чаргі і бой барабанаў рыхтуюць для адпраўкі ў В'етнам.

А вось на сцэну выходзіць Аня Пяскова — дыпломніца, самы «сталы» чалавек у калектыве. Неўзабаве яна пакіне родны універсітэт, уперадзе — цікавая і сур'ёзная прафесія матэматыка-праграміста. Спявае яна проста, пяшчотна і задушэўна.

...«Наш Поль Робсан», — жартоўна называюць сябры Юру Ражава, студэнта журфака. І сапраўды, голас у яго надзвычай густы і нізкі. Дарэчы, успамінаецца такі выпадак. У час канцэрта выпадкова «адказаў» мікрафон.

— Юра, дапамагай, — звярнуўся да хлопца вядучы канцэрта.

І Юра выправіў становішча. Ён цудоўна выканаў негрыцянскую народную песню «Місісіпі» без дапамогі тэхнікі.

Я расказаў толькі пра некаторых спевакоў. А музыканты? Фізікі і журналісты, філолагі і матэматыкі, юрысты і біёлагі... Усіх іх прывяла ў аркестр любоў да музыкі, да прыгожага і узвышанага. Эстрадны аркестр стаў для іх сапраўдным саюзам фізікаў і лірыкаў.

За канцэрт студэнтаў горача падзякаваў сакратар камітэта камсамола будоўлі Лукомльскай ДРЭС Генадзь Астапенка.

— Камсамольцы і моладзь будоўлі ДРЭС вельмі рады былі прыняць гасцей з універсітэта,—сказаў Г. Астапенка. — Хацелася б, каб сустрэчы будаўнікоў са студэнтамі сталі традыцыйнымі. Прыязджайце да нас часцей.

...Не за гарамі той дзень, калі заззяе яшчэ адно электрычнае сонца на нашай зямлі. У розныя куткі рэспублікі яго чарадзейныя промні прынясуць людзям святло і радасць. У сённяшніх студэнтаў, а заўтрашніх вучоных, настаўнікаў, інжынераў свае клопаты. Яны сядзяць за падручнікамі і канспектамі, здаюць экзамены і залікі, адкрываюць усё новыя і новыя таямніцы жыцця. Тыя ж, хто ў вялікім сяброўстве з мастацтвам, удакладняюць сваё майстэрства на рапетыцыях, рыхтуюцца да новых падарожжаў, да новых сустрэч.

**А. САКАЛОЎ.**



*Нядаўна на фабрыцы-кухні адчыніліся дзверы студэнцкай сталовай. Кожны дзень тут харчуецца пяць—шэсць тысяч студэнтаў. Павары рыхтуюць для іх разнастайныя смачныя і недарагія блюды.*

*НА ЗДЫМКУ: у студэнцкай сталовай.*

*Фота І. АСКІРКІ.*

КАРЫСНА ВЕДАЦЬ

# «ГІСТОРЫЮ АПІШУ ЗА РОСКАШ ЁЙ»

Беларускія старажытнадрукаваныя кнігі XVI—XVIII ст. ст. нават добра дасведчанаму чалавеку нярэдка ўяўляюцца зборам даволі аднастайных літаратурных выданняў, кананічных тэкстаў, багаслоўскіх трактатаў. У гэтым ёсць доля ісціны.

Беларускае кнігадрукаванне ў пачатку свайго развіцця сапраўды абапіралася ў многім на кананізаваныя творы бацькоў царквы і так званае «Святое пісанне».

У XVI стагоддзі ва ўсёй Еўропе не было больш аўтарытэтнай і больш спрэчнай кнігі, чым Біблія. Па свайму зместу гэты манументальны эклектычны звод разнастайных сацыяльна-гістарычных, медыцынскіх звестак і гераічных легенд меў багатыя магчымасці для стварэння розных ідэалагічных дактрын, якія шырока выкарыстоўваліся ў мэтах класавай барацьбы. Не выпадкова ў Заходняй Еўропе, гэтак жа, між іншым, як і ў Расіі, даволі доўгі час тэксты Бібліі, нават прасеяныя і зацверджаныя на царкоўных саборах, дазвалялася чытаць і тлумачыць выключна духавенству. У рукі свецкай паствы яны траплялі параўнаўча рэдка.

Таму здзіўляе той факт, што ўжо першыя беларускія выданні «Святога пісання» прызначаліся шырокім колам «простага народа» беларускага, «усім паспалітым к добраму научэню». У гэтых выданнях праследжваюцца ідэі свецкай адукацыі, гуманізма. У каментарыях да Бібліі беларускія кнігавыдаўцы выкладалі свае палітычныя, прававыя дактрыны (канцэпцыя «прыродазнаўчага права» Скарыны) ці падвяргалі сам тэкст пісання даволі рэзкай рацыяналістычнай крытыцы (гл. прадмову С. Буднага да выдання Новага Завета, Лоск, 1574 г.).

Нават па форме выкладання, па моўнай рэдакцыі, блізкай да жывой народнай гаворкі, па асаблівасцях кніжнага афармлення (партрэт Скарыны ў свяшчэнных біблейскіх кнігах!) выданні беларускіх першадрукароў выклікалі моцнае падазрэнне царкоўнікаў.

Беларуская царква выступала ў ролі адной з найбольш уплываючых ідэалагічных і адміністрацыйных інстанцый, якая непасрэдна кантралявала і, безумоўна, звужала магчымасці развіцця прагрэсіўнага кнігадрукавання. Вядома, напрыклад, што беларускі магнат Г. А. Хадкевіч, выкарыстаўшы паслугі маскоўскіх друкароў Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца, першапачаткова меў намер выдаць «Заблудаўскае Евангелле» 1569 г. «у мове беларускай». Але пад уплывам царкоўнікаў «загадаў выдрукаваць яе» традыцыйным царкоўна-славянскім тэкстам.

Некаторыя пазнейшыя выданні беларускіх друкарань, тым не менш, працягвалі моўныя традыцыі беларускіх першадрукароў. Хоць царкоўна-славянская мова, на думку выдаўцаў «Еўеўскага Евангелля» 1616 г., несумненна, з'яўляецца найбольш удалай, але з-за «няздольнасці слухачоў» і агульнай «уместнасці» беларускай мовы яны вырашылі перакласці пісанне на простую мову.

У прадмовах да іншых выданняў першай паловы XVII стагоддзя гэтыя рысы жывой народнай мовы, фальклорныя элементы адчуваюцца з яшчэ большай выразнасцю.

У розных выданнях беларускай віленскай друкарні ўспамінаюцца і цытуюцца многія творы Сакрата, Нерона, Платона, Цыцэрона, Авідзія, Златавуса, Іераніма і іншых аўтараў.

Свецкія навукова-прыкладныя белетрыстычныя выданні былі звычайнай прадукцыяй многіх уласных друкарань, якія выкарыстоўвалі розныя шрыфты (ад кірыліцы і лаціпіцы да італьянскага, нямецкага і французскага шрыфтоў у XVIII ст.).

З гэтага боку беларускае кнігадрукаванне яшчэ слаба вывучана. Дастаткова сказаць, што дзейнасць, напрыклад, Слуцкай друкарні многімі даволі аўтарытэтнымі даследаваннямі па гісторыі беларускай культуры апрыёрна аднесена да XVI стагоддзя. Ні адно выданне гэтай «паветранай» друкарні XVI ст. сучаснай бібліяграфіі невядома.

Незадоўга перад Другой сусветнай вайной польскі кнігазнаўца Л. Гоцэль выпадкова набыў у Варшаўскім антыкварным магазіне дзелавыя падлікі Слуцкай друкарні за 1673—1687 гг. Яны рэгістравалі 23 выданні з тыражамі, якія дасягалі ў некаторых выпадках 3000 экземпляраў. Сярод іх называюцца свецкія сачыненні: «табліцы гарызантальныя», «буквары», календары, дзённікі і нейкія «Рускія тэорыі», «Вікторыі над туркамі», навуковы трактат «Аб злучэнні рэк» і г. д.

У Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна захоўваецца слуцкае выданне «Манархіі турэцкай» 1678 года.

Шматлікія гравюры на медзі спецыяльна для слуцкага выдання прыгатаваў член Магілёўскага магістрата Максім Вашчанка. Пасля гэтыя гравюры М. Вашчанкі былі перакапіраваны для пецярбургкага выдання 1741 года, прычым, подпіс магілёўскага гравёра быў апушчаны.

Старажытнае беларускае кнігадрукаванне далёка не вычэрпвалася літургічнай літаратурай. Яно развівалася пад уздзеяннем сустрэчнага культурнага ўплыву заходне-еўрапейскай і рускай, украінскай кніжных традыцый. Але яно заключала ўнутраны змест, вострую сацыяльную накіраванасць і нацыянальнае мастацкае аблічча.

Г. ГАЛЕНЧАНКА,
кандыдат гістарычных навук.

**Кафедра зарубежнай літаратуры выказвае глыбокае спачуванне дацэнту БАГРОВАЙ Дыяне Пятроўне з прычыны напаткаўшага яе гора — смерці бацькі.**

**Адказны рэдактар**
**М. ІОСЬКА.**

Зак. 570. **Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».** АТ 02146